Аляксандр ВАБІШЧЭВІЧ

# Беларускае навуковае таварыства ў Вільні (1918–1939 гг.)



*ВАБІШЧЭВІЧ Аляксандр Мікалаевіч — кандыдат гістарычных навук, дацэнт, загадчык кафедры гісторыі славянскіх народаў Брэсцкага дзяржаўнага універсітэта імя А.С.Пушкіна. Нарадзіўся ў 1965 г. у в. Рубель Столінскага р-на Брэсцкай вобл. У 1990 г. закончыў гістарычны факультэт Беларускага дзяржаўнага універсітэта, у 1996 г. — аспірантуру Інстытута гісторыі НАН Беларусі. У 1990—1992 гг. працаваў настаўнікам у СШ № 21 г. Брэста. З 1992 г. — у Брэсцкім дзяржаўным універсітэце імя А.С.Пушкіна. Даследуе праблемы нацыянальна-культурнага развіцця Заходняй Беларусі ў 1920—1930-я гг., пытанні гістарычнага краязнаўства. Аўтар больш за 200 навуковых, навукова-папулярных, вучэбна-метадычных работ, у т. л. манаграфій "Асвета ў Заходняй Беларусі (1921—1939 гг.) (Брэст, 2004), "Нацыянальна-культурнае жыццё Заходняй Беларусі (1921—1939 гг.) (Брэст, 2008). Адзін з аўтараў калектыўных прац "Брэсцкі дзяржаўны універсітэт: старонкі гісторыі" (Брэст, 2005), Гісторыя Беларусі: У 6 т. Т. 5. (Мн., 2006).*

У савецкай гістарыяграфіі гісторыі Заходняй Беларусі прыярытэт надаваўся вывучэнню дзейнасці беларускіх партый і арганізацый рэвалюцыйна-дэмакратычнай арыентацыі. Даследаванне гісторыі нацыянальна-дэмакратычнага крыла заходнебеларускага руху стрымлівалася ідэалагічнымі абмежаваннямі і асабліва недаступнасцю архіўных крыніц. З-за гэтага па-за ўвагай гісторыкаў заставалася і дзейнасць Беларускага навуковага таварыства (БНТ) у Вільні. Толькі ў выданнях беларускай дыяспары з'яўляліся асобныя ўспаміны, юбілейныя артыкулы пра заснавальнікаў і актывістаў таварыства. У польскай гістарыяграфіі БНТ быў прысвечаны артыкул Я.Гарневіча, напісаны ў 1984 г. на абмежаваным коле крыніц, таму не пазбаўлены недакладнасцей і памылак[1].

У сучаснай беларускай гістарычнай навуцы дзейнасць БНТ таксама не стала пакуль прадметам спецыяльных даследаванняў. Яго гісторыі прысвечаны толькі невялікія навукова-папулярныя і энцыклапедычныя артыкулы М.Іванова, А.Ліса[2]. Асобныя аспекты дзейнасці БНТ закрануты ў публікацыях А.Сідарэвіча пра братоў Луцкевічаў, у манаграфіі А.Гужалоўскага па гісторыі беларускіх музеяў і некаторых іншых[3].

Асноўнай мэтай дадзенага артыкула з'яўляецца комплексны аналіз гісторыі БНТ: яго арганізацыйнай структуры, матэрыяльнага забеспячэння, кадравага складу, асноўных канцэптуальных метадалагічных і ідэалагічных прынцыпаў дзейнасці і яе вынікаў.

Беларускае навуковае таварыства ўтварылася ў Вільні ва ўмовах яе акупацыі нямецкімі войскамі ў перыяд Першай сусветнай вайны. Віленскія беларускія дзеячы планавалі пры яго дапамозе забяспечыць беларускія пачатковыя школы падручнікамі, адкрыць нацыянальны музей і паспрыяць яго арганізацыйнаму і навукова-метадычнаму станаўленню. Германскія акупацыйныя ўлады 23 студзеня 1918 г. далі дазвол на адкрыццё БНТ і зацвердзілі яго Статут, бо разлічвалі на практычную дапамогу таварыства нямецкім вучоным у іх даследаваннях па беларусазнаўству і на заваяванне даверу з боку беларускай інтэлігенцыі.

Аб заснаванні таварыства было абвешчана 26 студзеня 1918 г. на Беларускай канферэнцыі ў Вільні[4]. Паводле Статута, БНТ мела права ствараць і ўтрымліваць на свой кошт музеі, бібліятэкі, навуковыя ўстановы, наладжваць выстаўкі, экскурсіі, лекцыі, курсы, сходы, праводзіць конкурсы, займацца выдавецкай справай[5]. Статут абмяжоўваў дзейнасць БНТ тэрыторыяй горада Вільні.

Кіруючым органам з'яўлялася ўправа ("урад"), якая выбіралася ў колькасці дзевяці членаў тэрмінам на 3 гады на агульным сходзе

таварыства. Першым старшынёй управы быў выбраны барон К.Шафнагель, яго намеснікам — І.Луцкевіч, які адыграў значную ролю ў стварэнні і дзейнасці таварыства. Відавочна, вылучэнне на кіруючую пасаду К.Шафнагеля было ўзгоднена з нямецкай адміністрацыяй. У першы склад управы ўвайшлі таксама В.Ластоўскі, Д.Сямашка, Ю.Мэнке, Э.Мацкевіч і іншыя. Сярод заснавальнікаў БНТ былі ксёндз У.Талочка, князь В.Святаполк-Мірскі, В.Залескі, Я.Станкевіч і шэраг іншых дзеячаў.

Напачатку Беларускае навуковае таварыства актыўна супрацоўнічала з нямецкімі навукоўцамі. На пасяджэннях БНТ з дакладамі выступалі археолаг і мастацтвазнаўца А.Іпель, этнограф П.Вэбер, яго ўправу наведвалі К.Майнгоф, Г.Пік і іншыя нямецкія вучоныя. І.Луцкевіч яшчэ з даваеннага часу падтрымліваў кантакты з Р. Абіхтам з Брэслаўскага універсітэта.

Адным з першых мерапрыемстваў таварыства стала выстаўка беларускага старажытнага і дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва, наладжаная ў маі 1918 г. у Вільні пры падтрымцы штаба 10-й нямецкай арміі. У ёй прынялі ўдзел А.Іпель, І.Луцкевіч, В.Ластоўскі і іншыя дзеячы. У верасні 1918 г. яна была паказана ў Мінску як краёвая выстаўка старажытнасцей і прыгожых мастацтваў. Сярод іншых на выстаўцы дэманстраваліся матэрыялы з прыватных збораў І.Луцкевіча, перададзеныя ім Беларускаму навуковаму таварыству.

У сувязі з публікацыяй у мінскай газеце "Вольная Беларусь" прапаноў Я.Лёсіка аб правілах беларускага правапісу[6] на пасяджэнні ўправы БНТ 1 мая 1918 г. была выбрана камісія для разгляду падрыхтаваных да друку падручнікаў па беларускай граматыцы. А.Луцкевіч, які ў 1917 г. выдаў лацінкай у Вільні першую частку сваёй брашуры "Як правільна пісаць па-беларуску", выказаў на старонках газеты "Гоман" сваю нязгоду з прапановамі Я.Лёсіка. Мовазнаўчая камісія БНТ таксама зрабіла крытычны аналіз "Граматыкі беларускай мовы" Б.Пачобкі. Шэраг прапаноў і заўваг, выказаных у час гэтай навуковай палемікі, былі ўлічаны ў "Беларускай граматыцы для школ" Б.Тарашкевіча.

З канца 1918 г. актыўнасць дзеячаў БНТ значна знізілася. Гэта было звязана з адыходам германскіх войск з тэрыторыі Беларусі і пашырэннем польскай экспансіі. Не спрыяла навуковым заняткам і заангажаванасць актыву таварыства ў палітычнай дзейнасці структур БНР. Не толькі ідэйна-палітычныя размежаванні, але і асабістыя амбіцыі некаторых дзеячаў абумовілі адыход ад БНТ часткі ранейшага актыву (сярод іх быў і В.Ластоўскі). Найбольш актуальнай праблемай для актывістаў таварыства ў той час з'яўлялася захаванне былой калекцыі І.Луцкевіча. Пагроза над ёй навісла пасля таго, як у лютым 1919 г. Народны камісарыят асветы Сацыялістычнай Савецкай рэспублікі Літвы і Беларусі (ЛітБел) прыняў рашэнне аб нацыяналізацыі калекцыі. Аднак справа да гэтага не дайшла. У красавіку 1919 г. Вільня была акупіравана войскамі Польшчы.

На працягу 1921—1939 гг. старшынёй управы БНТ з'яўляўся А.Луцкевіч. У 1921 г. пры БНТ быў адкрыты Віленскі беларускі гісторыка-этнаграфічны музей імя І.Луцкевіча. Ён размясціўся разам з беларускай гімназіяй у мурах былога базыльянскага манастыра (Вільня, Вострабрамская, 9). Асновай фондаў музея стала прыватная калекцыя І. Луцкевіча. Новыя паступленні складаліся з закупленых ці ахвяраваных прыватнымі асобамі экспанатаў. Беларускі музей уключаў зборы археалагічных матэрыялаў, нумізматыкі, сфрагістыкі, помнікаў рэлігійнага мастацтва, свецкага жывапісу, народнага мастацтва, зброі, этнаграфічных матэрыялаў. Археалагічны збор налічваў больш за 200 артэфактаў. Сярод іх была і калекцыя мінскага археолага Г.Татура. Сярод матэрыялаў сфрагістыкі было больш за 100 пячатак[7]. Беларускае народнае мастацтва было прадстаўлена разьбой па дрэве, лубкамі, карцінамі, гравюрамі, адзеннем, калекцыяй слуцкіх паясоў і інш.[8].

Беларускі музей у Вільні меў таксама багатую бібліятэку. Аснову яе стварылі калекцыя кніг і старадрукаў І.Луцкевіча, частка бібліятэкі Е.Раманава, кнігазбор Б.Даніловіча. Да пачатку 1930-х гг. у бібліятэцы музея налічвалася каля 14 тыс. кніг. З рукапісных фаліянтаў вылучаліся Жухавіцкае евангелле XIV ст., трэбнік 1545 г., кітаб XVI ст. і інш.[9]. Сярод старадрукаў меліся асабліва каштоўныя экспанаты — Трыёдзь калярова 1491 г., частка пражскага выдання Бібліі Ф.Скарыны 1517 г., Статут ВКЛ 1588 г., кнігі друкарняў Беларусі XVI—XVIII стст. У бібліятэцы былі таксама савецкія выданні рознай тэматычнай накіраванасці на беларускай, рускай, польскай, літоўскай, ідыш і іншых мовах, перыядычны друк[10]. Сістэматычная выдача кніг з бібліятэкі музея пачалася з канца 1920-х гг.

Сярод рукапісаў музейнага архіва (каля 6 тыс. адзінак) былі помнікі пісьменнасці XIV—XV стст., граматы XIV—XIX стст. На працягу 1920—1930-х гадоў архіў назапасіў рукапісы твораў дзеячаў заходнебеларускай культуры (М.Гарэцкага, І.Дварчаніна, М.Танка, У.Жылкі, Р.Шырмы і іншых), а таксама многіх арганізацый і ўстаноў – Беларускага пасольскага клуба, Беларускай сялянска-работніцкай грамады (БСРГ), Таварыства беларускай школы, Беларускага інстытута гаспадаркі і культуры, беларускіх гімназій, БНТ і іншых[11].

Штат супрацоўнікаў беларускага музея быў мінімальны: дырэктарам ад моманту яго заснавання да восені 1939 г. з'яўляўся А.Луцкевіч, бібліятэкарам — У.Самойла. А.Неканда-Трэпка на грамадскіх пачатках выконваў абавязкі скарбніка. Час ад часу зборам матэрыялаў, мастацкім афармленнем займаўся Я.Драздовіч. Асноўнай крыніцай фінансавання работы музея былі ахвяраванні заходнебеларускай грамадскасці. З-за фінансавых цяжкасцей на працягу 1920-х гадоў не было наладжана сістэматычнае даследаванне фондаў музея. Матэрыялы для экспазіцыі аб'ядноўваліся па калекцыйнаму прынцыпу. Эклектычнасць структуры музея ўскладняла выкарыстанне яго фондаў у навуковых і асветніцкіх мэтах[12]. Навукова-асветніцкая дзейнасць таварыства да пачатку 1930-х гг. разгортвалася ў асноўным у мовазнаўчай секцыі і створанай 10 студзеня 1927 г. музейнай радзе, у якую ўвайшлі А.Луцкевіч, Б.Тарашкевіч, А.Не-

канда-Трэпка. Толькі ў сярэдзіне 1930-х гг. былі складзены каталогі музея, бібліятэкі і архіва.

Нягледзячы на цяжкасці, кіраўніцтва БНТ збіральніцкую працу лічыла прыярытэтным напрамкам сваёй дзейнасці. Пошукі матэрыялаў для музея ажыццяўляліся рознымі шляхамі. Па заданню БНТ летам 1926 г. Я.Драздовіч праводзіў экспедыцыю ў Пінскім, Столінскім, Лунінецкім паветах, дзе замалёўваў помнікі драўлянага дойлідства, народныя строі, прадметы сялянскага побыту і хатняга ўжытку[13]. БНТ імкнулася далучыць да збіральніцкай працы інтэлігенцыю, студэнтаў, вучняў, духавенства. Так, на агульным сходзе БНТ 20 жніўня 1924 г. быў прыняты зварот да святароў праваслаўнай і рымска-каталіцкай цэркваў, настаўнікаў аб пошуках кніг, грамат і іншых старажытных твораў пісьменнасці[14].

Акрамя фінансавых праблем дзейнасць Беларускага навуковага таварыства ўскладнялася наўмыснымі перашкодамі з боку "крэсавых" польскіх аб'яднанняў і польскай адміністрацыі. У 1922 г. беларускай гімназіі і музею пагражалі высяленнем з базыльянскіх муроў у сувязі з нашумелай справай "вязніцы А.Міцкевіча". Спецыяльная камісія БНТ правяла расследаванне, вынікі якога прадставіла ў змешаную польска-беларускую камісію пры дэпартаменце асветы Сярэдняй Літвы ў форме пратакола яе пасяджэння. Адзначалася, што ў базыльянскіх мурах не захавалася падзямелляў, дзе ў 1823 г. быў зняволены А.Міцкевіч, а існуючыя памяшканні былі дабудаваны ў 1865 г.[15]. А.Луцкевіч у 1923 г. апублікаваў асобную брашуру па гэтым пытанні. Такім чынам удалося адстаяць маёмасныя правы беларускай гімназіі і музея. Аднак далейшае іх знаходжанне ў базыльянскіх мурах заставалася няпэўным. У красавіку 1924 г. на агульным сходзе БНТ было ўзнята пытанне аб набыцці ўласнага будынка для музея[16]. Але больш канкрэтныя крокі ў гэтым напрамку пачалі рабіцца толькі ў канцы 1920-х гг. Агульны сход БНТ 26 лютага 1928 г. вырашыў распачаць збор сродкаў для будаўніцтва ў Вільні Дома беларускай культуры, дзе маглі б размясціцца музей і іншыя культурна-асветніцкія арганізацыі. Ахвяраванні акумуляваліся на спецыяльным рахунку Беларускага кааператыўнага банка[17]. У 1930 г. на рахунку налічвалася больш за 10 тыс. злотых, аднак з-за крызіснага становішча банка сродкі не ўдалося выкарыстаць.

Акрамя ўтрымання музея актыў БНТ у пачатку 1920-х гг. займаўся распрацоўкай беларускай навуковай тэрміналогіі, перакладам на беларускую мову гістарычнай, педагагічнай, мастацкай і іншай літаратуры. У прыватнасці, А.Луцкевіч і А.Смоліч пераклалі "Сусветную гісторыю" В.Остэрлёфа і Я.Шустэра, А.Луцкевіч — "Элементарную алгебру" А.Кісялёва. На жаль, немагчыма дакладна вызначыць колькасць кніг, падрыхтаваных да друку намаганнямі актывістаў БНТ. Паводле падлікаў Ю.Туронка, з 261 назвы беларускіх кніг, выдадзеных у міжваеннай Польшчы, толькі 10 выйшлі пад грыфам БНТ[18]. Аднак рэальны ўклад арганізацыі, на мой погляд, быў значна большы, таму што аўтары многіх кніг не ўказалі сваё дачыненне да БНТ.

Асноўнай формай прэзентацыі навуковых здабыткаў таварыства з'яўляліся даклады і паведамленні па гісторыі, этнаграфіі, літаратуры, мове, фальклоры Беларусі, якія прадстаўляліся на яго пасяджэннях. Буйной грамадска-культурнай акцыяй, наладжанай БНТ, стала ўрачыстае святкаванне 400-годдзя беларускага кнігадрукавання. Юбілейныя ўрачыстасці праводзіліся ў 1925 г., бо многія тагачасныя даследчыкі лічылі, што Ф.Скарына вярнуўся з Прагі ў Вільню ў 1525 г. Да юбілею было прымеркавана выданне брашуры А.Станкевіча "Доктар Францішак Скарына — першы друкар беларускі (1525–1925)". Спачатку яна друкавалася на старонках газеты "Крыніца" лацінкай, а затым выйшла асобным выданнем кірыліцай пад эгідай БНТ. Пазней таварыства адзначыла яшчэ некалькі юбілейных гістарычных дат (у 1929 г. — 400-годдзе Статута ВКЛ 1529 г., у 1930 г. — 500-годдзе смерці вялікага князя літоўскага Вітаўта і іншыя). Праводзіліся ўрачыстыя сходы ("акадэміі"), змяшчаліся юбілейныя матэрыялы ў заходнебеларускім друку.

У асяроддзі інтэлігенцыі Заходняй Беларусі станоўча ўспрымаліся поспехі нацыянальна-культурнага будаўніцтва ў Савецкай Беларусі ў 1920-я гг. Польскія ўлады ўсяляк перашкаджалі навуковым кантактам дзвюх раз'яднаных частак Беларусі. А.Луцкевіч не змог прыняць удзел у Акадэмічнай канферэнцыі па рэформе беларускага правапісу і азбукі ў Мінску ў лістападзе 1926 г., бо яму, як і іншым заходнебеларускім дэлегатам, не выдалі замежных пашпартоў. Нягледзячы на перашкоды, БНТ да пачатку 1930-х гг. падтрымлівала цесныя сувязі з Інбелкультам, Беларускай акадэміяй навук, асобнымі прадстаўнікамі творчай і навуковай інтэлігенцыі БССР.

Беларускае навуковае таварыства не мела пастаяннага складу, што было абумоўлена як ідэалагічнымі разыходжаннямі, так і адтокам яго членаў у заходнебеларускія партыйныя структуры. Напрыклад, Б.Тарашкевіч, І.Лагіновіч і іншыя дзеячы былі ўцягнуты ў актыўную палітычную барацьбу ў Заходняй Беларусі, таму не маглі спаўна аддаць таварыству свой талент і арганізацыйныя здольнасці. У першай палове 1920-х гг. некаторыя з актыўных членаў БНТ — М.Гарэцкі, А.Грыневіч, М.Кахановіч, А.Смоліч — пераехалі ў БССР.

Уздым дзейнасці БСГ непасрэдна адбіўся на дзейнасці БНТ у 1927–1928 гг. Пасля арышту А. Луцкевіча і прыцягнення яго да судовага працэсу па справе Беларускай сялянска-работніцкай грамады становішча таварыства на пэўны час дэстабілізавалася. Кіраўніцтва бягучымі справамі таварыства засяродзілася тады ў руках А.Неканды-Трэпкі, І.Дварчаніна, І.Савіцкага, С.Паўловіча. Ідэйна-палітычныя разыходжанні паміж імі ўзмацніліся з адмаўленнем А.Луцкевіча ад усялякага дачынення да БСРГ. Гэта прывяло да расколу БНТ. З яго складу выйшлі дзеячы Беларускай хрысціянскай дэмакратыі, перасталі супрацоўнічаць прыхільнікі рэвалюцыйна-дэмакратычных поглядаў. У бок БНТ пасыпаліся абвінавачванні ад заходнебеларускіх камуністаў у здрадзе інтарэсам рэвалюцыйнай барацьбы. У студзені 1929 г. II пленум

ЦК КПЗБ заявіў, што "нацыянал-фашысцкая група Луцкевіча-Астроўскага ... імкнулася прывіць нацыянальна-вызваленчаму руху традыцыі дробнабуржуазнага нацыяналізму"[19]. Усё гэта звужала падтрымку таварыства з боку грамадскасці.

У ходзе далейшай дыферэнцыяцыі заходнебеларускага руху БНТ апынулася ў ліку 15 арганізацый і ўстаноў, якія ў 1930 г. увайшлі ў склад Цэнтральнага саюза культурных і гаспадарчых арганізацый (Цэнтрасаюза). Лідэры новага аб'яднання Р.Астроўскі, А.Луцкевіч, Ф.Акінчыц, Я.Станкевіч шукалі кампрамісаў з "санацыйным" рэжымам Ю.Пілсудскага (за што атрымалі неафіцыйную назву "беларуская санацыя"). У прыватнасці, яны спадзяваліся на падтрымку беларускай гімназіі і музея ў Вільні з боку ваяводы У.Рачкевіча[20]. Паводле некаторых звестак, абяцаная дапамога павінна была складаць штомесячна 2,5 тыс. злотых для гімназіі і 1 тыс. злотых для музея[21]. Аднак спадзяванні на такое досыць добрае фінансаванне не спраўдзіліся. Толькі прыток у склад БНТ у канцы 1920-х гг. заходнебеларускай інтэлігенцыі нацыянальна-дэмакратычнай арыентацыі, асабліва моладзі з Віленскага і Пражскага універсітэтаў, ажывіў яго дзейнасць. Сярод новых актывістаў былі Р.Шырма, М.Ільяшэвіч, В.Грышкевіч, М.Пецюкевіч, Б.Кіт, С.Станкевіч, М.Чарнецкі, М.Шкялёнак і іншыя. У 1930 г. у структуры БНТ была створана краязнаўча-турыстычная секцыя, якую ўзначаліў М.Ільяшэвіч. Першай буйной акцыяй гэтай секцыі стала мастацка-этнаграфічная выстаўка ў Вільні вясной 1930 г., на якой экспанаваліся малюнкі Я.Драздовіча, абразы і малюнкі П.Сергіевіча, этнаграфічныя фотаздымкі У.Грыневіча.

У 1931 г. беларускі музей атрымаў афіцыйны статус навуковай установы. Для яго пачала выдзяляцца невялікая дзяржаўная дапамога, што дазволіла распачаць інвентарызацыю экспанатаў музея і бібліятэкі. Па прапанове БНТ студэнцкае аб'яднанне "Скарынія" наладзіла ў 1932 г. цыкл навукова-папулярных лекцый[22]. Аднак з пераўтварэннем у 1932/33 навучальным годзе Віленскай беларускай гімназіі ў філіял польскай традыцыя іх правядзення была спынена. Восенню 1932 г. у дадатак да музейнай і мовазнаўчай секцыі былі створаны гістарычная і літаратурна-мастацкая секцыі таварыства. Такая структура БНТ праіснавала да восені 1939 г.

З набыццём статуса навуковай установы ў беларускага музея пашырыліся магчымасці для экспанавання ўласных збораў. Музей прыняў удзел у выстаўцы, прысвечанай А.Міцкевічу (Навагрудак, 1932 г.), агульнапольскай выстаўцы народнага мастацтва (Варшава, 1937 г.), палескай выстаўцы (Львоў, 1938 г.) і іншых. Калі ў 1920-я гг. беларускі музей наведвалі адзінкавыя даследчыкі, то ў 1930-я гг. кола зацікаўленых навукоўцаў пашырылася, актывізавалася асветніцкая работа з моладдзю. Як сведчыць кніга для запісу гасцей, у 1932 г. сярод наведвальнікаў былі студэнты Віленскага універсітэта імя Стафана Баторыя, вучні Віленскай беларускай гімназіі, а таксама вучоныя і грамадскія дзеячы, у тым ліку з замежных краін (М.Біржышка з Коўна, Г.Віршубскі з Берліна)[23]. Паводле ацэнак даследчыкаў, на працягу 1933—1938 гг. беларускі музей наведалі 14,5 тыс. чалавек, у ім было наладжана 428 экскурсій[24]. Толькі ў 1937 г. у якасці наведвальнікаў зафіксавана больш за 4,5 тыс. чалавек, праведзена 110 экскурсій[25]. З БНТ цесна супрацоўнічаў навуковы гуртох студэнтаў-беларусаў Віленскага універсітэта імя С. Баторыя – Таварыства прыяцеляў беларусаведы (1931–1939 гг.). Беларускі музей падтрымліваў сувязі з іншымі музейнымі ўстановамі Вільні – музеем Таварыства сяброў навукі, які прадстаўляў і прапагандаваў польскую культуру, музеем Літоўскага навуковага таварыства, яўрэйскім і татарскім музеямі.

Як прызнанне пазіцыі згодніцтва "беларускай санацыі" з уладамі трэба разглядаць запрашэнне ў 1935 г. прадстаўнікоў БНТ (А.Луцкевіча і В.Грышкевіча) да ўдзелу ў рабоце VI Агульнапольскага з'езда гісторыкаў у Вільні. Разам з тым іх гатоўнасць удзельнічаць у рабоце гэтага з'езда магла быць звязана і з намерамі кіраўнікоў БНТ пазнаёміць польскіх навукоўцаў са сваім поглядам. А.Луцкевіч у сваім дакладзе "Народавольцы-беларусы і іх орган "Гоман" адзначыў, што на старонках часопіса ўпершыню быў сфармуляваны пастулат "дзяржаўнай самастойнасці Беларусі ў складзе Расійскай федэрацыі"[26], у ходзе дыскусіі ён адназначна сцвярджаў беларускую этнічную прыналежнасць І.Грынявіцкага[27]. В.Грышкевіч у дакладзе "Роля беларускіх зямель у польска-літоўскіх уніях" паспрабаваў прасачыць станаўленне ВКЛ як поліэтнічнай дзяржавы, што адбывалася ў ходзе жорсткай барацьбы літоўскай і беларуска-ўкраінскай (усходнеславянскай) арыстакратыі[28].

Адзначым, што старшыня ўправы Беларускага навуковага таварыства А.Луцкевіч апублікаваў вялікую колькасць прац па гісторыі беларускай дзяржаўнасці, нацыянальна-вызваленчага руху, а таксама па літаратуразнаўчай і культуралагічнай праблематыцы. Аднак многія яго матэрыялы засталіся ненадрукаванымі. Сярод іх – рукапіс па айчыннай гісторыі, дзе з нацыянальна-дэмакратычных пазіцый адлюстравана эвалюцыя дзяржаўнасці на тэрыторыі Беларусі з глыбокай старажытнасці[29].

Яшчэ з 1922 г. планавалася выданне штогодніка БНТ, але з-за адсутнасці фінансавых сродкаў рэалізацыя гэтай задумы адкладвалася. Толькі ў 1933 г. удалося надрукаваць навуковы зборнік "Гадавік Беларускага навуковага таварыства ў Вільні", аднак наладзіць рэгулярны яго выхад не ўдалося. У 1938 г. быў выдадзены зборнік "Запісы Беларускага навуковага таварыства". Гэтыя зборнікі вызначаюцца шырокім тэматычна-праблемным дыяпазонам. У першым з іх даследуецца літаратура беларускіх татараў (Я.Станкевіч), грамадская дзейнасць канцлера ВКЛ Л. Сапегі (М. Шкялёнак), падзелы Рэчы Паспалітай і інтэграцыя беларускіх зямель у склад Расійскай імперыі (М.Ільяшэвіч), гісторыя беларускага музея ў Вільні (А.Луцкевіч), замкавае дойлідства Віцебшчыны (Б.Брэжга) і іншыя тэмы.

Матэрыялы другога зборніка сведчаць аб пэўнай эвалюцыі ў поглядах некаторых дзеячаў БНТ на ай-

чынную гісторыю. У артыкуле М. Шкялёнка, які ў другой палове 1930-х гг. належаў да той групы нацыянальных радыкалаў, якая аб'ядноўвалася вакол газеты "Беларускі фронт", была падвергнута крытыцы перыядызацыя гісторыі Беларусі У.Ігнатоўскага і прапанавана ўласная. Пры гэтым традыцыя менавіта беларускай дзяржаўнасці празмерна абсалютызавалася, ігнараваўся поліэтнічны, поліканфесіянальны характар ВКЛ, якое аўтар адназначна прызнаваў беларускай дзяржавай[30].

Навуковыя і навукова-папулярныя артыкулы сяброў БНТ друкаваліся таксама на старонках часопісаў "Шлях моладзі", "Студэнцкая думка", "Калоссе" і іншых. Часам у гэтых артыкулах праяўлялася абсалютызацыя нацыянальнай праблемы, выказваліся меркаванні аб выключнасці беларусаў сярод іншых славянскіх народаў. Так, у працы Я.Станкевіча "Беларускія плямёны і іхняе рассяленне" (1930 г.) зроблена спроба на падставе моўных звестак правесці дэмаркацыю беларускай этнічнай тэрыторыі на момант існавання старажытных славянскіх плямёнаў. Міфалагізуючы гістарычнае мінулае, Я.Станкевіч прыпісваў беларускую нацыянальную свядомасць полацкім князям XII ст.[31]. ВКЛ уяўлялася Я.Станкевічу монаэтнічнай (беларускай) дзяржавай — Вялікім княствам Беларускім, а яго правіцелі — адпаведна "вялікімі князямі беларускімі" ("літоўскімі"). Як і іншыя заходнебеларускія аўтары, ён ідэалізаваў Вітаўта, "геній якога не меў сабе роўнага"[32]. Радыкальна настроеныя аўтары нярэдка давалі зневажальныя ацэнкі тым беларусам, якія паддаліся нацыянальна-культурнай асіміляцыі — "культурныя рабы", "сляпыя адзінкі" і г. д.[33].

З канца 1920-х гг. кіраўніцтва БНТ усё больш крытычна ставілася да грамадска-палітычных і культурных працэсаў у Савецкай Беларусі. Рашучаму непрыманню савецкай рэчаіснасці паспрыяла тое, што некаторыя былыя члены таварыства (І.Дварчанін, С.Рак-Міхайлоўскі і іншыя) сталі ў СССР ахвярамі сталінскіх рэпрэсій. На надзвычайным агульным сходзе БНТ 31 кастрычніка 1933 г. былі прыняты рэзалюцыі пратэсту супраць рэформы правапісу ў БССР, якая была ацэнена як "акт чыста палітычны"[34]. Праўда, не ўсе заходнебеларускія дзеячы прытрымліваліся такой пазіцыі. Сярод прыхільнікаў рэформы правапісу быў С.Паўловіч.

Супярэчнасці, што нарасталі ў "беларускай санацыі", прывялі ў 1935 г. да канчатковага разрыву А.Луцкевіча і яго прыхільнікаў з Р.Астроўскім з-за грашовых махінацый апошняга. Унутраны канфлікт ускладняў дзейнасць БНТ, не спрыяў пашырэнню яго аўтарытэту ў заходнебеларускім грамадстве.

У канцы 1930-х гг. БНТ апынулася ў даволі складаным становішчы. Праўда, у адрозненне ад іншых заходнебеларускіх арганізацый, што падвергліся рэпрэсіям і былі забаронены ў 1936—1938 гг., Беларускае навуковае таварыства працягвала дзейнічаць легальна. Але сціплае фінансаванне ўскладняла работу беларускага музея ў Вільні. Управа БНТ звярталася да польскага ўрада з просьбай аб дапамозе для беларускага музея з Фонду нацыянальнай культуры (Funduszu kultury narodowej), але гэты зварот быў пакінуты без увагі.

Віленскае ваяводскае ўпраўленне планавала аб'яднаць беларускі музей з музеем Літоўскага навуковага таварыства ў адзіны рэгіянальны дзяржаўны музей. Польскія чыноўнікі прапанавалі менавіта А.Луцкевічу заняцца арганізацыяй такога музея і ўзначаліць яго, аднак той рашуча адмовіўся[35]. У адказ з чэрвеня 1938 г. выдаткаванне штомесячных дзяржаўных субсідый для беларускага музея было спынена.

Беларускае навуковае таварыства не з'яўлялася масавай грамадскай арганізацыяй. Паводле некаторых звестак, у канцы 1930-х гг. у складзе БНТ налічваліся 64 чалавекі (у 1938 г. разам з членамі грамадскага фонду па падтрымцы беларускага музея — 120 чалавек[36]). Большасць складала заходнебеларуская інтэлігенцыя, студэнты, гімназісты пераважна з Вільні. Акрамя кіруючага ядра на чале з А.Луцкевічам у рабоце БНТ удзельнічалі актывісты беларускага грамадска-культурнага жыцця ў Польшчы (ксёндз А.Станкевіч, Я.Шутовіч, М.Пецюкевіч, А.Клімовіч, Ф.Стацкевіч, П.Сергіевіч, Х.Ільяшэвіч, кампазітар К.Галкоўскі, прафесар Варшаўскага політэхнічнага інстытута В. Іваноўскі і шэраг іншых), а таксама інжынер К.Дуж-Душэўскі з Літвы, які аказваў матэрыяльную падтрымку музею, дзеячы беларускай дыяспары ў Латвіі К.Езавітаў, П.Мірановіч, С.Сахараў і іншыя. Адносіны да БНТ меў і аўтар даволі спрэчнага беларускага "Лемантара" С.Любіч-Маеўскі[37].

Пасля далучэння Заходняй Беларусі да СССР шэраг лідэраў і актывістаў БНТ (А.Луцкевіч, У.Самойла, А.Неканда-Трэпка, В.Багдановіч і іншыя) былі ў кастрычніку 1939 г. арыштаваны органамі НКУС, арганізацыя фактычна перастала дзейнічаць. Беларускі музей у Вільні пасля ўтварэння Літоўскай ССР быў перададзены ў падпарадкаванне рэспубліканскай акадэміі навук, а ў 1945 г. канчаткова закрыты.

Па-рознаму скláліся лёсы былых членаў БНТ. Частка з іх была падвергнута сталінскім рэпрэсіям, некаторыя далучыліся да лагера беларускіх калабарантаў у перыяд нацысцкай акупацыі, апынуліся ў эміграцыі. Менавіта гэтыя ідэалагічныя і палітычныя акалічнасці і прадвызначалі негатыўныя адносіны ў БССР да дзейнасці БНТ на працягу многіх пасляваенных дзесяцігоддзяў, выключалі магчымасць аб'ектыўнага вывучэння яго гісторыі.

Беларускае навуковае таварыства не стала цэнтрам каардынацыі ўсёй навукова-даследчыцкай работы ў Заходняй Беларусі. Прычынамі гэтага з'яўляліся, з аднаго боку, нацыянальная палітыка ўлад, што не былі зацікаўлены ў сур'ёзнай і доўгатэрміновай падтрымцы даследаванняў па беларускай праблематыцы, з другога — спецыфіка сацыяльна-эканамічнага жыцця і нацыянальна-вызваленчага руху на заходнебеларускіх землях. Ва ўмовах геапалітычных змен кіраўніцтва таварыства імкнулася выкарыстоўваць кан'юнктурныя магчымасці для рэалізацыі статутных задач. Прыярытэтная ўвага надавалася даследаванням у галіне сацыяльна-гуманітарных, гістарычных, філалагічных навук, мастацтвазнаўства, а

таксама захаванню гісторыка-культурных каштоўнасцей, што знаходзіліся ў фондах беларускага музея ў Вільні. Праблемы прыродазнаўчых навук не былі аб'ектам даследавання дзеячаў БНТ. Адсутнасць умоў для правядзення фундаментальных даследаванняў прадвызначыла дамінаванне ў дзейнасці БНТ навукова-асветніцкага напрамку.

Аналіз дзейнасці БНТ дазваляе вылучыць у яго функцыянаванні некалькі перыядаў.

Першы перыяд (1918—1920 гг.) характарызаваўся станаўленнем таварыства ва ўмовах нямецкай акупацыі і наступнай зменлівай геапалітычнай сітуацыі. Работа арганізацыі была абмежавана мовазнаўчымі даследаваннямі, наладжваннем выставак, клопатам пра захаванне прыватнай калекцыі І. Луцкевіча.

У другім перыядзе (1921—1926 гг.) адбывалася адаптацыя таварыства да грамадска-палітычных умоў і нарматыўна-прававой сістэмы II Рэчы Паспалітай. Адкрыццё беларускага музея ў Вільні прадвызначыла асноўныя напрамкі дзейнасці БНТ, сярод якіх прыярытэтнае значэнне мелі захаванне гісторыка-культурнай спадчыны, пошукавая работа. Арганізацыйная структура таварыства толькі пачала складвацца.

Трэці перыяд (1927—1930 гг.) быў адзначаны адносным заняпадам дзейнасці БНТ. З-за прыцягнення да судовага працэсу па справе БСРГ старшыні ўправы БНТ А. Луцкевіча і ідэйна-палітычнага размежавання ў заходнебеларускім руху адбыўся адток з яго складу прыхільнікаў хрысціянска-дэмакратычных і рэвалюцыйна-дэмакратычных поглядаў.

Чацвёрты перыяд (1931—1939 гг.) быў даволі супярэчлівы. З аднаго боку, палітычная лаяльнасць, згодніцтва "беларускай санацыі" паспрыялі набыццю ў 1931 г. беларускім музеем статусу навуковай установы, допуску дзеячаў БНТ да агульнапольскіх навуковых і навукова-асветніцкіх мерапрыемстваў, што садзейнічала павышэнню яго вядомасці ў Польшчы. Прыток у таварыства беларускага інтэлігенцкага і вучнёўска-студэнцкага актыву паспрыяў ажыўленню яго дзейнасці, пашырыў формы навукова-асветніцкай працы. Канчаткова склалася структура таварыства, у якой найбольш дзейснымі адзінкамі сталі секцыі. З другога боку, у тагачасных абставінах не было магчымасцей для поўнага выканання статутных задач. Улічваючы адсутнасць фінансавай падтрымкі і адміністрацыйны ціск польскіх улад на беларускі музей у канцы 1930-х гг. і спробы яго ліквідацыі, можна меркаваць, што і ў выпадку захавання Польскай дзяржавы Беларускае навуковае таварыства не мела перспектыў на існаванне.

[1] Garniewicz J. Białoruskie Towarzystwo Naukowe w Wilnie (1918—1939) // Acta Baltico-Slavica. T. XVI. Wrocław—Warszawa—Kraków—Gdańsk—Łodź, 1984. S. 97—109.

[2] Іваноў М. У міжваенным часе, у забраным краі...: Беларускае навуковае Таварыства ў Вільні // Літаратура і мастацтва. 1993. 24 снежня. С. 14—15; Ліс А.С. Беларускае навуковае таварыства // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі: У 6 т. Т. 1. Мн., 1993. С. 355.

[3] Гужалоўскі А.А. Музеі Беларусі (1918—1941 гг.). Мн., 2002.

[4] Гадавік Беларускага Навуковага Таварыства (далей — Гадавік БНТ). Кн. 1. Вільня, 1933. С. 5.

[5] Цэнтральная навуковая бібліятэка НАН Беларусі. Аддзел рэдкіх кніг і рукапісаў (далей — ЦНБ НАНБ. АРКР). Ф. 23, воп. 1, спр. 67, арк. 2; Беларускі дзяржаўны архіў-музей літаратуры і мастацтва (далей — БДАМЛіМ). Ф. 3, воп. 1, спр. 3, арк. 2; Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь (далей — НАРБ). Ф. 883, воп. 1, спр. 25, арк. 6—12.

[6] Гл.: Лёсік Я. Творы. Мн., 1994. С. 265—268.

[7] Луцкевіч А. Беларускі музэй імені Івана Луцкевіча. Вільня, 1933. С. 4.

[8] ЦНБ НАНБ. АРКР. Ф. 23, воп. 1, спр. 558, арк. 1—186; спр. 560, арк. 1—206.

[9] Lietuvos mokslu akademijos biblioteka. Skyriuus manuskriptai (далей — LMAB. SM). F. 21, в. 379, l. 2.

[10] ЦНБ НАНБ. АРКР. Ф. 23, воп. 1, спр. 559, арк. 1-217; BAML. SM. F. 21, в. 2309/І—ІІ, l. 1—127; в. 379, l. 6-36.

[11] LMAB. SM. F. 21, в. 2161, l. 16—24; Лабынцаў Ю.А. Архіў беларускага адраджэння. Мн., 1993. С. 19—31.

[12] Гужалоўскі А.А. Музеі Беларусі (1918—1941 гг.). С. 107, 110.

[13] ЦНБ НАНБ. АРКР. Ф. 2, воп. 1, спр. 4, арк. 1—29.

[14] Гадавік БНТ, с. 12.

[15] Заходняя Беларусь. Вільня, 1924. С. 124, 131—132; Гадавік БНТ. С. 10; Луцкевіч А. Выбраныя творы: праблемы культуры, літаратуры і мастацтва. Мн., 2006. С. 384.

[16] Крыніца. 1924. 29 красавіка.

[17] Гадавік БНТ, с. 14; Białoruskie zeszyty historyczne. № 28. Białystok, 2007. S. 79.

[18] Turonek J. Książka białoruska w II Rzeczypospolitej 1921—1939. W-wa, 2000. S. 15.

[19] НАРБ. Ф. 242п, воп. 1, спр. 247, арк. 39—40.

[20] Антон Луцкевич: материалы следственного дела НКВД БССР. Мн., 1997. С. 85.

[21] НАРБ. Ф. 242п, воп. 1, спр. 463, арк. 19.

[22] Дзяржаўны архіў Брэсцкай вобласці. Ф. 1, воп. 9, спр. 1622, арк. 842 адв.

[23] LMAB. SM. F. 21, в. 2049, l. 2.

[24] Гужалоўскі А.А. Музеі Беларусі (1918—1941 гг.). С. 112; Ateneum Wileńskie. R. XIV. Wilno, 1939. Zeszyt 1. S. 365; З успамінаў Янкі Шутовіча пра Віленскі беларускі музэй // Спадчына. 1995. № 1. С. 34.

[25] Калоссе. 1938. № 1 (14). С. 63.

[26] LMAB. SM. F. 21, в. 339, l. 34.

[27] Pamiętnik VI Powszechnego zjazdu historyków polskich w Wilnie, 17—20 września 1935 r. Lwów, 1936. T. II. S. 62.

[28] БДАМЛіМ. Ф. 3, воп. 1, спр. 13, арк. 9.

[29] LMAB. SM. F. 21, в. 331, l. 10.

[30] Запісы Беларускага навуковага таварыства. Сшытак першы. Вільня, 1938. С. 39.

[31] Станкевіч Я. Гістарычныя творы. Мн., 2003. С. 29—30.

[32] Станкевіч Я. Беларускія мусульмане і беларуская літаратура арабскім пісьмом. Вільня, 1933. С. 3.

[33] Шкялёнак М. Беларусь і суседзі: гістарычныя нарысы. Беласток, 2003. С. 255.

[34] Платонаў Р. Моўная рэформа 1933 года. Пратэст БНТ у Вільні // Літаратура і мастацтва. 1993. 17—23 ліпеня. С. 12.

[35] Антон Луцкевич: материалы следственного дела НКВД БССР. С. 192; Запісы Беларускага навуковага таварыства. С. 40.

[36] Іваноў М. У міжваенным часе, у забраным краі... С. 15; БДАМЛіМ. Ф. 3, воп. 1, спр. 1, 4.

[37] НАРБ. Ф. 878, воп. 1, спр. 18, арк. 6—7.